Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-10-26

# Пункцірам

✔Каардынацыйнае пасяджэнне грамадскіх арганізацый беларусаў праходзіць сёння ў Маскве. На ім плануецца разгледзець пытанні двухбаковага супрацоўніцтва. З беларускага боку да ўдзелу запрошаны прадстаўнікі міністэрстваў культуры і адукацыі, а таксама Дзяржаўнага цэнтра нацыянальных культур і Інстытута культуры Беларусі.

✔Навінкі ад беларускіх кнігавыдаўцоў прадстаўлены на 57-й Міжнароднай кніжнай выстаўцы ў Белградзе (Сербія), якая праходзіць з 21 па 28 кастрычніка. Сёлета выстаўка сабрала каля 500 удзельнікаў з 22 краін. Нашу краіну прадстаўляюць РВУ "Літаратура і Мастацтва", "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", "Мастацкая літаратура" і Свята-Елісавецінскі манастыр у Мінску.

✔ Падчас "круглага стала" па пытаннях расійска-беларускага супрацоўніцтва і пашырэння сувязей у сферы літаратуры, культуры і навукі, які праходзіў у Маскве, НАН Беларусі прапанавала Расіі каля 10 праектаў адпаведнага кірунку. Сярод іх — падрыхтоўка і выданне на рускай мове ў 25 тамах акадэмічнай серыі па класіцы беларускай літаратуры; распрацоўка эфектыўных механізмаў набыцця беларускіх навуковых і энцыклапедычных выданняў, класікі для бібліятэк Расіі; стварэнне цэнтра па падтрымцы двухбаковых праектаў і праграм. Былі выказаны і прапановы па выданні часопіса "Белая Вежа".

✔ За галоўныя ўзнагароды ў конкурснай праграме міжнароднага кінафестывалю "Лістапад" будуць змагацца 74 кінастужкі. Акрамя таго, запланавана і шырокая пазаконкурсная праграма, творчыя сустрэчы і рэтраспектывы. Майстроў і аматараў кіно, а гэта госці з 35 краін блізкага і далёкага замежжа, мінскі фестываль чакае з 2 па 9 лістапада.

✔ На гэтым тыдні Белтэлерадыёкампанія завяршыла прыём заявак на ўдзел у адборачным туры "Еўрабачання-2013". Цяпер ідзе іх падлік. Папярэдняя лічба — каля 60 заявак. На лістапад запланаваны паўфінал, у які выйдуць 15 выканаўцаў — іх імёны будуць названы 31 кастрычніка. Фінал пройдзе 7 снежня. Узначальвае журы старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька. Нагадаем, што міжнародны песенны конкурс "Еўрабачанне" пройдзе ў маі наступнага года ў шведскім горадзе Мальмё.

✔Белтэлерадыёкампанія аб'яўляе пра пачатак конкурсу канала "Культура" Беларускага радыё на стварэнне электраакустычных кампазіцый Formanta. Адна з умоў конкурсу: у аснове кампазіцый павінны быць сапраўдныя гукі, якія характэрныя для Беларусі ці асацыіруюцца з ёю. Работы прымаюцца да 31 снежня бягучага года.

**Падрыхтавала**

✔Беларус Анатоль Сіўко стаў уладальнікам другой прэміі на II Міжнародным конкурсе вакалістаў імя Мусліма Магамаева, які праходзіў у Маскве. Усяго на конкурс было пададзена больш як 200 заявак, аднак да ўдзелу былі дапушчаны толькі 17 вакалістаў з 10 краін.

**Падрыхтавала**
**Таццяна МАСТОЎСКАЯ**